ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"
Навукова-даследчы інстытут гісторыі і культуры ўсходнеславянскіх народаў пры ГДУ імя Францыска Скарыны
20 кастрычніка 2017 года ў г. Гомелі
праводзяць VII Міжнародную навуковую канферэнцыю

"Скарына і наш час"

Прапануюцца наступныя тэмы для абмеркавання:

- **Эпоха і справы Скарыны.**
- **Традыцыі Ф.Скарыны.**
- **Нацыянальная мова ў гістарычна-культурным працэсе.**
- **Праблемы сучаснай дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі.**
- **Вывучэнне розных узроўняў беларускай літаратурнай мовы.**
- **Беларуская лексікаграфія.**
- **Актуальныя пытанні анамастыкі.**
- **Міжмоўная камунікацыя і моўныя кантакты.**
- **Дыскусійныя пытанні этналінгвістыкі.**
- **Мова і сродкі масавай камунікацыі.**
- **Пераклад і інтэрпрэтацыя тэксту.**
- **Стылістыка мастацкага слова.**
- **Фальклор – культура – мастацтва.**

Для удзелу ў канферэнцыі неабходна **да 30 чэрвеня 2017 года** даслаць на адрас аргкамітэта **анкету-заяўку** на ўдзел у канферэнцыі (форма дадаецца). Электронны варыянт тэксту артыкула аб'ёмам **да 5 старонак** выслаць да **1 верасня 2017 г.**

Арганізацыйны ўнёсак – 18 бел. рублёў – выслаць паштовым пераводам або аплаціць падчас канферэнцыі. Без аплаты арганізацыйнага ўнёску прымаюцца публікацыі аўтараў, якія маюць вучоную ступень доктара навук або вучонае званне прафесара.

Патрабаванні да афармлення матэрыялаў: тэксты дакладаў прадстаўляюцца ў тэкставым рэдактары Microsoft Word 97/2000/2003 для Windows праз 1 інтэрвал кеглем Times New Roman, памер 12 пт. Палі: верхняе– 2,0 см, ніжняе – 2,0 см, левае і правае – 2,0 см. Абзац – 1, 25 см. Выдзяленні ў тэксце – *курсівам.* Спасылкі на літаратуру – па меры з'яўлення ў тэксце, напр.: [1, с. 15]. Спіс выкарыстаных крыніц (памер шрыфта – 11 пт.) – у канцы тэксту. Афармленне літаратуры ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК.

Рабочыя мовы – беларуская, руская, украінская.

Зборнік навуковых артыкулаў плануецца выдаць да пачатку работы канферэнцыі. Знешнім (завочным) удзельнікам зборнік будзе высылацца ў электронным выглядзе (у фармаце .pdf) на ўказаны імі адрас электроннай пошты пры паўторным запросе на адрас Аргкамітэта пасля заканчэння канферэнцыі. **Рассылка праз паштовыя аддзяленні** Аргкамітэтам **не прадугледжана**.

Аргкамітэт пакідае за сабою права на адхіленне матэрыялаў, калі яны не адпавядаюць тэматыцы канферэнцыі і тэхнічным патрабаванням.

Выдаткі на праезд, харчаванне і пражыванне – за кошт удзельнікаў канферэнцыі.

Просім да ***15 верасня 2017 г.*** пацвердзіць свой прыезд, неабходнасць у гасцініцы.

Адрас для карэспандэнцыі: 246019, вул. Савецкая, 104, г.Гомель, Рэспубліка Беларусь, УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, кафедра беларускай мовы, Ермаковай Алене Мікалаеўне ці Тарасенка Марыі Віктараўне. Тэл. (8 0232) 602-265 (кафедра беларускай мовы).

E-mail: belchair@gsu.by

Узор афармлення матэрыялаў

На першым радку (пасля УДК (памер шрыфта 12) курсівам друкуецца прозвішча аўтара, (памер шрыфта 14, ***курсіў***, выраўноўванне па цэнтры (***А. А. Пятрова***).

Назва даклада друкуецца 14 кеглем вялікімі тлустымі літарамі (выраўноўванне па цэнтры). Яна павінна быць сфармулявана лаканічна і дакладна, аб’ёмам не больш двух радкоў.

Анатацыя – праз 2 інтэрвалы пасля назвы артыкула друкуецца 10 кеглем.

Тэкст артыкула набіраецца праз 1 інтэрвал пасля тэксту анатацыі.

УДК 378.661-057.875(476.2)

Т.А. Карніеўская

Іменаслоўная сістэма горада Гомеля пачатку XXI стагоддзя

Артыкул прысвечаны разгляду асноўных пазіцый гомельскага іменаслову 2000–2005 гадоў. Аналіз антрапанімікону праводзіцца згодна з распрацаванай схемай, у якой улічваюцца асноўныя статычныя і дынамічныя паказчыкі іменаслоўнай сістэмы. Тэарэтычныя распрацоўкі дапаўняюцца паказчыкамі, якія атрыманы ў выніку аналізу суцэльнай выбаркі антрапонімнага матэрыялу. Разглядаюцца паходжанне імён, іх ужывальнасць, варыянтнасць. Апрацаваны фактычны матэрыял змешчаны ў табліцах. У тэарэтычным

Уласнае імя з’яўляецца не толькі лінгвістычнай адзінкай. Спецыфічнае становішча гэтай адзінкі патрабуе больш глыбокіх і рознабаковых даследаванняў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Капанадзе, Л.А. Взаимодействие терминологической и общеупотребительной лексики / Л.А. Капанадзе // Развитие лексики современного русского языка. – М.: Наука, 1965. – С. 86-103.

Заяўка
на ўдзел у VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі
“Скарына і наш час”
(20 кастрычніка 2017 года)

Прозвішча_____

Імя_____

Імя па бацьку_____

Месца працы_____

Пасада_____

Вучоная ступень_____

Вучонае званне_____

Назва даклада_____

Праблематыка_____

Электронны адрас_____

Паштовы хатні ці працоўны адрас (індэкс)_____

Тэлефоны, факс_____

Дата_____